

# КАШЧЫЦ
# Марыя Іосіфаўна

Нарадзілася ў 1939 годзе ў вёсцы Падбалоцце Зэльвенскага раёна.

Марыя Іосіфаўна пачала свой працоўны шлях 15-гадовай дзяўчынкай пасля заканчэння 8 класаў. Працавала на сельскай гаспадарцы, а ў вячэрні час атрымлівала сярэднюю адукацыю ў Падбалоцкай вячэрняй школе. Пасля працавала рабочай Зэльвенскага хлебапрыёмнага пункта, рабочай ДЭУ.

З 1963 года працаўладкавалася даяркай на Падбалоцкую ферму. За час працы зарэкамендавала сябе адказным і добрасумленным работнікам.

Разам з мужам выгадавала сямёра дзяцей. Узнагароджана медалямі I і II ступені “Медаль мацярынства” ў 1973, 1974 гг., ордэнам “Мацярынская слава” ў 1977 г.

Марыі Іосіфаўне прысвоена званне “Заслужаны калгаснік”.

Пастановай праўлення калгаса, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 06 лютага 1989 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Кашчыц М.І. занесена ў Кнігу Працоўнай Славы калгаса.